*Агееў А.Р. (Магілёў)*

# НАПАЛЕОНАЎСКІЯ ВОЙНЫ І ЛЁС ЯЎРЭЯЎ УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

У віхор ваенных падзей пачатку XIX ст. яўрэі Беларусі былі ўцягнуты, як і іншыя народы Расіі. Цяжар падрыхтоўкі да вайны лёг перш-наперш на плечы шэраговых расійскіх падаткаплацельшчыкаў. Асабліва цяжка даводзілася насельніцтву прыгранічных губерняў – тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага, на якой жыла асноўная частка расійскіх яўрэяў. Тутэйшыя жыхары не толькі плацілі значна ўзросшыя падаткі, але і вымушаны былі ўдзельнічаць у ваенным будаўніцтве, ва ўтрыманні шматлікіх ваенных гарнізонаў. Адмоўна адбіваліся на іх матэрыяльным становішчы армейскія пастоі і рэквізіцыі пад час войнаў 1805—1807 гг. Пастоі выклікалі стабільнае незадавальненне мяшчан і сялян Беларусі. Нягледзячы на прадпісанні міністра ўнутраных спраў аб раўнамернасці гэтай павіннасці, у гэтай справе назіраліся шматлікія парушэнні інструкцый, нераўнамернасць у размеркаванні пастаяльцаў па дамах, у тым ліку паміж хрысціянскімі і яўрэйскімі жыхарамі горада, хабарніцтва і, натуральна, скаргі.[1]

Яўрэі імкнуліся адкупіцца ад павіннасці, якая не толькі пагаршала жыллёвыя ўмовы, але і моцна ўскладняла правядзенне рэлігійных абрадаў. Маскоўская кампанія прынесла беларускім яўрэям, як і ўсім жыхарам Беларусі, яшчэ больш страшныя выпрабаванні. Тэрыторыя краіны з самага пачатку вайны стала арэнай баявых дзеянняў. Абедзьве арміі праводзілі масавыя рэквізіцыі, выкарыстоўвалі яўрэяў у якасці разведчыкаў. Калі добраахвотнікаў не было, то афіцэры нярэдка пагрозамі прымушалі яўрэяў, як і беларускіх сялян, выконваць разведвальныя функцыі. Да канца ліпеня амаль уся Беларусь, за выключэннем усходняга Палесся, перайшла пад кантроль французаў.

Нягледзячы на замацаваныя ў гістарычнай літаратуры традыцыйныя ўяўленні аб паводзінах французскай арміі, ва ўспамінах сведкаў вайны згадак аб масавых рабунках французаў у гарадах Усходняй Беларусі, як правіла, няма. Больш таго, амаль усе адзначалі карэктныя паводзіны французаў. Так, жыхары Магілёўскай губерні пісалі ў сваіх успамінах: "... французы ўвогуле вялі сябе прыстойна і не было нараканняў на іх",[2] "... не магу сказаць, каб гэтыя атрады займаліся рабункамі і гвалтам".[3] У этнічна французскіх злу-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чэннях была даволі высокая дысцыпліна, марадзёрства імкнуліся выкараняць у зародку. Асабліва строгімі былі парадкі ў корпусе маршала Даву. А вось у нямецкіх часцях баяздольнасць і дысцыпліна былі ніжэйшыя. Гэтую асаблівасць адзначае і расійскі гісторык Н.А.Троіцкі, які піша, што чынілі рабункі і гвалты "галоўным чынам не французскія часці", а ў першую чаргу нямецкія: вестфальскія, баварскія і інш..".[4] На Магілёўшчыне этнічнанямецкіх войск было няшмат. Большую частку лета ў гарадах края знаходзіліся войскі Герцагства Варшаўскага, або сфарміраваныя ў Літве і Беларусі. Яны прычынілі нямала бед яўрэям Магілёва. Аднак агульнага рабавання, паводле сведчанняў сучаснікаў падзей, не было.[5]

Французы эксплуатавалі рэсурсы краю. Насельніцтва было абкладзена вялікімі падаткамі, але памеры рабавання ў літаратуры відавочна перабольшваліся. Так, у Магілёве не было рабунку, хаця многія крамы яўрэяў былі ўзламаныя.[6] У Чавусах яўрэйскія шынкі былі "разбіты" пасля сыходу рускіх войск і яшчэ да прыходу французскіх. Так што да з'яўлення французаў "чэрнь" паспела ўдосталь пакарыстацца дармавой гарэлкай.[7] З прыходам французаў усталяваўся пэўны парадак. Многія багатыя жыхары самі запрашалі французаў да сябе з мэтай аховы сваіх дамоў ад злодзеяў і рабаўніцтва.[8] Хто больш рабаваў – войскі, марадзёры ці мясцовыя рабаўнікі, – з успамінаў і дакументаў не зусім зразумела. Але не падлягае сумненню тое, што ваенныя дзеянні нанеслі значныя матэрыяльныя страты яўрэям. Насельніцтва гарадоў падпарадкоўвалася французскім уладам, спраўна збірала падаткі, абслугоўвала французскую армію. Тут быў арганізаваны рамонт і выраб амуніцыі, рыштунку. У будынку Магілёўскай праваслаўнай семінарыі хрысціяне і яўрэі шылі на французскія і польскія палкі мундзіры, боты і ўсё патрэбнае.[9] За кошт падаткаў і збораў фарміраваліся мясцовыя органы ўлады, нацыянальная гвардыя і г.д. Быхаўскія шаўцы выконвалі французскія заказы, а адзін толькі кагал мястэчка сабраў каля 7 000 руб. на ўтрыманне нацыянальнай гвардыі.[10] Кагал Магілёва сабраў больш за 30 тыс.руб., у той час як хрысціяне горада – толькі 15 тыс.[11] Яўрэйскія кагалы ў сінагогах, як і хрысціяне ў цэрквах і касцёлах, прысягалі на вернасць Напалеону.[12] Памочнікам мэра ў Магілёве быў яўрэй Копзан.[13]

Адносіны яўрэяў да ваяваўшых бакоў апісваюцца ў літаратуры супярэчліва. У сучасных беларускіх выданнях, як правіла, падкрэсліваецца, што "немалая колькасць беларускіх яўрэяў прыняла актыўны ўдзел у Айчыннай вайне 1812 года на баку рускай арміі", што яны "былі добрымі разведчыкамі і ўмелымі забеспячэнцамі". Узгадваецца дзейнасць яўрэйскіх лазутчыкаў, прыводзяцца прыклады дапамогі яўрэяў рускім войскам ды ўказваецца на значэнне "яўрэйскай пошты".[14] У некаторых работах вывад яшчэ больш катэгарычны: "беларускія яўрэі падтрымалі рускі бок", многія равіны прадказвалі пагібель Вялікай Арміі".[15] Падобныя погляды выказваюцца і ў некаторых замежных выданнях.[16] У найбольш грунтоўнай, па гэтым пытанні, працы С.М.Гінзбурга "Отечественная война 1812 года и русские евреи», выдадзенай яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя, даказваецца, што "рускае яўрэйства выявіла ... актыўную адданасць Расіі, варожасць непрыяцелю". У ёй

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

узгадваюцца шматлікія прыклады дапамогі яўрэяў рускім войскам.[17] Некаторыя расійскія военачальнікі таксама ўзгадвалі прыклады дапамогі яўрэяў.

Успаміны сведкаў вайны, якія заставаліся на занятай французамі тэрыторыі, малююць крыху іншую карціну. Яўрэі, як народ практычны і асцярожны ў адносінах з уладамі, захоўвалі знешні спакой. У Чавусах "Пры набліжэнні войска Напалеона ў яўрэяў не было відаць ні радасці, ні страху, ні смутку, ні маркоты...".[18] Калі новая ўлада ўсталявалася, яўрэі былі лаяльнымі да яе. Яны выконвалі загады, рабілі неабходныя пастаўкі. Сведка падзей таго часу ў Магілёве К.К.Арнольдзі ва ўспамінах пісаў, што яўрэі "у час знаходжання французаў намагаліся ў размовах пазбягаць рускай мовы і гаварылі пераважна па-польску, нават рускія грошы прымалі толькі са скідкай. Па выгнанні ж непрыяцеля ўсё змянілася – пачалі размаўляць па-руску і замежная манета страціла ў іх нармальны кошт".[19] Той жа Гінзбург прызнаваў, што сярод яўрэяў Беларусі і Літвы было, безумоўна, нямала тых, хто адносіўся да тагачасных падзей "з індыферэнтызмам", што магчыма, былі асобныя яўрэі, якія "з карысці, або страху" аказвалі паслугі непрыяцелю.[20] Больш пэўна выказваюцца замежныя даследчыкі: "У 1812 Вялікая Армія выкарыстоўвала яўрэяў і як шпіёнаў, і як забеспячэнцаў неабходнага правіянту...".[21]

Супярэчлівыя ацэнкі адносін яўрэяў да вайны ў гістарычнай літаратуры маюць аб'ектыўную падставу – супярэчлівасць становішча французскай арміі ў Беларусі. Палітыка Францыі гэтага часу – гэта палітыка захопу, з аднаго боку, і асветніцтва і вызвалення ад феадалізму, – з другога. Паляпшэнне становішча французскіх і нямецкіх яўрэяў, абяцанне аднаўлення гістарычнай радзімы на Святой зямлі рабіла імя Напалеона дужа папулярным сярод яўрэяў Еўропы. Беларускія яўрэі ў большасці меркавалі, што "Напалеон прыязна ставіцца да яўрэяў".[22] У той жа час рэвалюцыйныя навацыі французаў выклікалі недавер артадаксальных яўрэяў Беларусі. У рэвалюцыйнай Францыі яны бачылі "сканцэнтраванне бязбожнасці".[23] Многія яўрэйскія равіны баяліся падрыву асноў іудаізму, паслаблення ўлады кагалаў, некаторыя з іх прадказвалі пагібель улады Напалеона. У 1798 г. (ці 1800) лідэр беларускіх хасідаў Шнеур Залман зрабіў кабалістычным шляхам прароцтва лёсу Напалеона: "Верхаводы мяцежнікаў французскіх спярша будуць мець поспех, але ў канцы будуць пасаромлены, бо цар (цары?) праўды адпомсціць ім, засячэ іх мячом і пакорыць, і загіне муж Банапарт – тады свет супакоіцца і ўзрадуецца".[24] Пасля пачатку вайны ён заклікаў сваіх паслядоўнікаў дапамагаць рускай арміі. Нягледзячы на прадказанні многіх іудзейскіх лідэраў пра паражэнне французаў, яўрэі не маглі быць упэўнены ў выніку ваеннай кампаніі, асцерагаліся рабавання з боку войскаў, і з прычыны свайго залежнага становішча вымушаны былі дапамагаць абодвум бакам канфлікту, з надзеяй на ласку пераможцы.

Ва ўспамінах і літаратуры, на наш погляд, відавочна перабольшваюцца факты дапамогі яўрэяў рускай арміі. Нават тыя, што паўтараюцца ў розных выданнях, зусім не так адназначны, як уяўляецца. Шклоўскага яўрэя Эцінгона расстралялі за тое, што ён не паказаў французам шлях на Магілёў, бо гэта супярэчыла яўрэйскім законам – "запаведзям Божым",[25] а не за тое,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

што дапамагаў рускім. У некаторых сучасных публікацыях Хаіма Ратнера называюць "разведчыкам з Магілёва",[26] але ці рабіў ён што-небудзь, упэўнена мы сказаць не можам. Пра яго засталося толькі паданне, што было зафіксавана праз стагоддзе пасля падзеі.[27] У сувязі з пералічаным вышэй больш узважанай уяўляецца пазіцыя, выказаная яшчэ ў дарэвалюцыйных публікацыях Юлія Гесена: "Айчынная вайна прынесла яўрэйскаму насельніцтву многа бедстваў, матэрыяльныя страты і маральныя пакуты... Рускія і непрыяцельскія афіцэры прымушалі яўрэяў быць лазутчыкамі, і многія палі ахвярамі палявых судоў. Аднак, яўрэі часцяком добраахвотна даносілі рускім аб руху французскіх войск. Урад ахвотна карыстаўся яўрэямі як пастаўшчыкамі".[28]

Расія здолела перамагчы самага магутнага заваёўніка XIX ст. Але перамога выклікала самазаспакоенасць, прыпыніла рэформы і спрыяла кансервацыі адсталых сацыяльна-эканамічных і палітычных адносін у краіне. Не змянілася да лепшага пасля вайны і становішча беларускіх яўрэяў. Калі ў многіх еўрапейскіх краінах у гэтую эпоху пачалася яўрэйская эмансіпацыя, то ў Расіі абмежаванні для яўрэяў сталі яшчэ больш жорсткімі.

## ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ:

1 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ), ф. 1297, воп. 1, спр. 201, л. 6–8; спр. 203, 210, 212.

2 Арнольди К.К. Французы в Могилёве-на-Днепре // Русская старина. 1873. Август. С. 236.

3 Романовский А.М. Французы в г.Чаусах в 1812 году (из воспоминаний очевидца) // Русская старина. 1877. Т. XX. С. 693.

4 Троицкий Н.А. 1812. Великий год России. М., 1988. С. 52.

5 Арнольди К.К. Французы в Могилёве-на-Днепре С. 236; Ерашэвіч А. Магілёў у час вайны 1812 г. // Мінулая і сучасная гісторыя Магілёва: Зб.навук.прац. Магілёў, 2001. С. 129.

6 Арнольди К.К. Французы в Могилёве-на-Днепре. С. 236.

7 Романовский А.М. Французы в г. Чаусах в 1812 году. С. 691.

8 Арнольди К.К. Французы в Могилёве-на-Днепре С. 236.

9 Археографический сборник документов, относящихся к истории северо-западной Руси. Т. II. Вильно, 1867. С. LXXXI, XXXII.

10 НГАБ, ф. 1297, воп. 1, спр. 543, л. 1–7.

11 Ерашэвіч А. Магілёў у час вайны 1812 г. С. 131.

12 Археографический сборник документов... С. LXXXII.

13 Ерашэвіч А. Магілёў у час вайны 1812 г. С. 130.

14 Евреи. По страницам истории. Мн., 1997. С. 187, 188; Иоффе Э.Г. Страницы истории евреев в Беларуси: Краткий научно-популярный очерк. Мн., 1997. С. 46, 47.

15 Кузняева С. Еврейские общины Беларуси в конце XVIII–начале XX века. Мн., 1998. С. 12.

16 Клиер Дж.Д. Россия собирает своих евреев. (Происхождение еврейского вопроса в России: 1772–1825). Москва–Иерусалим, 2000, 5760. С. 23, 24.

17 Гинзбург С.М. Отечественная война 1812 года и русские евреи. СПб., 1912. С. 71, 83.

18 Романовский А.М. Французы в г. Чаусах в 1812 году. С. 689.

19 Арнольди К.К. Французы в Могилёве-на-Днепре С. 236.

20 Гинзбург С.М. Отечественная война 1812 года и русские евреи. С. 46,47.

21 Hartley J. Napoleon in Russia: Saviour or Antichrist? // History today. 1991. January. P. 30.

22 Гессен Ю. Наполеон Бонапарт // Еврейская энциклопедия. Т. XI. СПб. С. 516.

23 Кузняева С. Еврейские общины Беларуси... С. 12.

24 Гессен Ю. Наполеон Бонапарт. С. 516; Гинзбург С.М. Отечественная война 1812 года и русские евреи. С. 55–56.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

25 Гинзбург С.М. Отечественная война 1812 года и русские евреи. С. 83; Левин В., Мельцер Д. Чёрная книга с красными страницами. (Трагедия и героизм евреев Беларуси). Балтимор (США), 1996. С. 24.

26 Левин В., Мельцер Д. Чёрная книга с красными страницами... С. 24.

27 Гинзбург С.М. Отечественная война 1812 года и русские евреи. С. 78, 79.

28 Гессен Ю. История еврейского народа в России. Москва–Иерусалим, 1997, 5753. С. 176.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова